# ГРОДНА, ТАБЕ НАШЫ ВЕРШЫ І ПЕСНІ!

**Пад такім дэвізам  прадстаўнікі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ выступілі на дні нараджэння любага горада, якому трэцяга верасня споўнілася 894 гады.**

У музычна-паэтычнай праграме на вуліцы Савецкай, якая ў гэты дзень пераўтварылася ў вуліцу Тэатральную, выступілі паэты Браніслаў Ермашкевіч – патрыярх беларускай паэзіі і адзін з заснавальнікаў гродзенскага Саюза пісьменнікаў; Рыгор Гармаш – украінскі паэт, для якога Беларусь, Гродзеншчына сталі другой Радзімай; Святлана Глембоцкая – паэтэса, кіраўнік гарадскога літаратурнага аб’яднання настаўнікаў і ветэранаў педагагічнай працы «Надзея»; былая настаўніца роднай мовы і літаратуры Людміла Мілоста; паэты больш маладога, сучаснага пакалення: Антаніна Нурэтдзінава і Надзея Саўчук-Германовіч; былы дзіцячы доктар, аўтар дзвюх вялікіх кніг паэзіі Ірына Полудзень і старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, паэтэса Людміла Кебіч.

У праграме ўзялі ўдзел і значна аздобілі яе вакальны мужчынскі ансамбль «Гарадзенцы», якім кіруе ўжо шмат гадоў выбітны музыкант і кампазітар Валерый Міхайлавіч Кручкоў (*на фота*). Музыкі выканалі песні не толькі на словы гродзенскіх паэтаў, але і праспявалі для душы вядомыя раней, чым узнялі настрой прысутных да самай высокай ступені.




**Выступае паэт Браніслаў Ермашкевіч**







**Рыгор Гармаш** **Надзея Саўчук-Германовіч**







**Людміла Кебіч** **Святлана Глембоцкая**




**Ірына Полудзень**




**Выступае паэтэса Антаніна Нурэтдзінава**


www.grodnonews.by


ЖУРНАЛ О ГОРОДЕ
ГРОДНО

***

Яшчэ на адной пляцоўцы свята адпрацавалі пісьменнікі. Каля кніжнай крамы «Праметэй» вядомая гродзенская празаік Ліна Багданава і паэтэса Людміла Кебіч правялі прэзентацыю кніг гродзенскіх пісьменнікаў для дзяцей і дарослых. Працаўнікі кнігарні зладзілі выстаўку, на якой былі прадстаўлены творы Ірыны Фамянковай і Віктара Кудлачова, Ганны Скаржынскай-Савіцкай і Таццяны Сучковай, Людмілы Шаўчэнкі і іншых аўтараў. Пісьменніцы, якія добра ведаюць творы сваіх калег, з задавальненнем расказалі пра выстаўленыя на стэндзе кнігі, іх аўтараў і змест, нават хапіла часу прачытаць невялікія ўрыўкі і вершыкі з іх. А Галіна Анатольеўна правяла з дзецьмі, што сабраліся вакол століка з кнігамі, гульню, у якой трэба было адказаць на некалькі пытанняў пра свае любімыя творы і літаратурныя жанры і нават размаляваць картачкі ў той ці іншы колер.

Нельга сказаць, што кнігі з аўтографамі расхваталі ў імгненне, але тое, што зацікаўленасць была, гэта адназначна. І кнігі гродзенскіх паэтак набылі, і радаваліся, калі матулі і бабулі куплялі сваім дарагім унукам і дзецям кніжку ў падарунак. А мы радаваліся таму, што пашырылі ў гэты святочны дзень кругагляд гарадзенцаў, і яны цяпер больш ахвотна будуць заглядаць у кнігарню «Праметэй» за новымі кнігамі гродзенскіх пісьменнікаў.

***ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА***

***На фота:*** эпізоды святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 894-годдзю горада Гродна і іх удзельнікі, прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі. 3 верасня 2022 года.



**Празаік Ліна Багданава з чытачамі**




**Аўтограф-сесію праводзіць старшыня ГрАА СПБ, паэтэса Людміла Кебіч**








Мішка-прывід
Лина Богданова


Мішка-прывід
Жахлічок
Детектив
Лина Богданова


про Алёшку
Людмила КЕБИЧ
Стихи для детей младшего возраста




Аптека




ГРОДНО ГРОДНА GRODNO HRODNA